
В руководство страны должны прийти талантливые и одаренные люди, патриоты Беларуси и ее народа".

Чытач А.Гнеўка, ліквідатар аварыі на ЧАЭС з горада Віцебска, закранае непасрэдна чарнобыльскае: неабходна жорсткая ахова, асабліва забруджанай 30-кіламетровай зоны; высяленне ўсіх з забруджаных тэрыторый; правядзенне радыяцыйнага абследавання ўсіх абшараў рэспублікі; не на словах, а на справе — строгі ўлік усіх чарнобыльцаў і іх дзяцей, нашчадкаў увогуле, належныя сацыяльныя ўмовы, іх лекаванне, аздараўленне... То ці не святая праўда?!

Між іншым, М.Каняховіч, афіцэр у адстаўцы, з Пружанаў, што на Берасцейшчыне, не цешыць сябе ілюзіямі, што ўсё тое, што варта рабіць, будзе зроблена, не, ён не разменьваецца і на дробныя тэзы, ён перакананы ў тым, што *"калі нам неяк і папупіцца, то пачынаць патрэбна з суда над палітычнымі злачынцамі краіны і ўводу войскаў блоку НАТО. Але мы нікому не патрэбныя, — піша ён, — каб хтосьці мог заступіцца, а таму і праграма CORE страчвае сэнс, бо не столькі вырашае пытанні, колькі патурае антынароднаму рэжыму, бо ён абавязкова гэтую дапамогу будзе выдаваць за сваю. Хіба мала прыкладаў таму? Вось адзін з іх. Хто фінансаваў пабудову ў Гомелі цэнтра пералівання крыві? А хто выдаў гэта за свае дасягненні і тым самым выканаў ролю мухі ў байцы пра вала і муху: мы аралі! Няхай бы лепей немцы дапамагалі чэчэнцам або іракцам — там людзі сапраўды хочуць жыць, а мы — не. Дык навошта тлуміць галаву тым замежным партнёрам, хоць бы і немцам?"*

Цяжкі выпадак з настроем гэтага майго, так бы мовіць, карэспандэнта. Але ж і ён, відавочна, мае рацыю. Ён шчыры, як і ўсе тыя, хто мне напісаў і каму я тут выказваю сваю ўдзячнасць. Праўда, я пакуль устрымаюся ад абагульненняў думак, высноў, балазе іх болей чым дастаткова і ў лістах, якія я цытаваў, а вось канкрэтных фактаў і спасылак на варункі жыцця, на жаль, няма. Скажам... калі засяваюць забруджаныя і, тым больш, спісаныя з сельскагаспадарчага абароту абшары, то **дзе** (канкрэтна) засяваюць і **хто** засявае? Калі радыяцыю расцягваюць з чарнобыльскай зоны на іншыя землі, то **якім чынам** і куды? Тут процьма пытанняў. Але ж няма лістоў з пацярпелых у чарнобыльскай катастрофе раёнаў, што проста засмучае мяне. Я нагадваю пра гэта і буду чакаць водгукаў зноў на той жа свой адрас: 220002, Мінск, вул. Крапоткіна, 44, Саюз "Чарнобыль", або на адрас рэдакцыі газеты.

Гэты завочны дыспут чытачоў па першым пытанні (а па другім — размова яшчэ будзе) хочацца скончыць вершаванымі радкамі з ліста вышэйназванага ўжо М.Лагодзіча-Касміны:

Мудры кажа: жыць прыстойна
гэта значыць — самастойна,
і шчасліва, і сумленна
у краіне суверэннай.
Час усім пра гэта знаць
і ў саюз народ не гнаць.
Годзе з нас рабіць халопаў...
Прыклад свой дае Еўропа,
як сягоння трэба жыць,
каб з дзікунства не тужыць.

Уражвае адно ўзровень самасвядомасці і вострага сацыяльнага зроку нашых чытачоў. І калі такія лісты пішуцца, не згібець Беларусі, якія б тэрарыстычныя акцыі супраць яе нацыянальнага духу не задумваліся дзяржаўнай "ідэалогіяй". Не забудзем, хто мы, якія былі, ёсць і будзем!

СУД

Спор поэтов

В конце 2003 года вышла в свет книга "Современная русская поэзия Беларуси. Антология", в которую вошли стихи 222 авторов. В том числе Дианы Балыко, Марины Куновской и Ольги Ровной. Исходя из того, что авторские договора с ними не заключались, вопрос об их участии в этой книге не обсуждался, авторское вознаграждение не выплачивалось, они подали в патентную коллегию Верховного Суда Республики Беларусь иск к А.Аврутину и УП "Технопринт" о защите нарушенных исключительных авторских прав.

О данной книге девушки узнали от составителя сборника А.Аврутина, который уже после выхода издания обзванивал авторов с предложением выкупить "Антологию" по цене 12 долларов за экземпляр. *"Образно говоря,* — говорит Д.Балыко, — *получилось так, будто у меня кто-то взял мой пиджак, затем звонит мне и говорит, что, мол, хороший у тебя пиджачок, выкупи-ка ты его у меня".*

Как сказано в исковом заявлении, М.Куновская передавала свои стихотворения для публикации в журнале "Немига", редактором которого является А.Аврутин, однако при этом стихотворения предоставлялись только в целях публикации в этом издании. Д.Балыко и О.Ровная вообще не передавали своих стихотворений ни А.Аврутину, ни УП "Технопринт".

Прежде чем составить иск, девушки решили урегулировать спор в досудебном порядке. *"Однако,* — пояснили они, — *составитель категорически отказался обсуждать не только выплату авторского вознаграждения, но даже получение одного авторского экземпляра книги на каждого истца, ссылаясь на то, что для нас — молодых литераторов — большая честь поучаствовать в данном сборнике. А сама "Антология" якобы имеет большое историческое значение в развитии литературного процесса".*

"К тому же, — говорит Д.Балыко, — *во всем этом присутствует важный для нас и очень неприятный аспект: книга называется "Современная русская поэзия Беларуси. Антология". Мы категорически против размещаться в современной* **русской** *поэзии, так как считаем себя белорусскими русскоязычными авторами, принадлежащими к белорусской культуре. Поэтому мы категорически не согласны с таким названием книги.*

Издатели говорят об исторической ценности данного издания. Но и этот вопрос нас несколько смущает: в "Антологии" нет никакой информации об авторах, кроме нескольких фотографий из архива составителя, а стихи отобраны, исходя из вкусов Аврутина. Представленные произведения совершенно не отображают нашего творчества. Например, мое стихотворение, вошедшее в этот сборник, использовано в черновой редакции и, кроме всего прочего, было написано восемь лет назад, а поставлено как представляющее основную тему моего творчества. Еще до издания этого сборника вышел екатеринбургский альманах "Воскресенье", в котором я участвовала как белорусский автор, пишущий на русском языке, и в нем была опубликована уже новая редакция этого стихотворения. Я же расту, меняюсь, по-другому смотрю на творческие моменты".

К слову сказать, Диана Балыко — автор трех книг поэзии: "Много-много дней" (1999 г.), "Окна настежь" (2001 г.), "Убегающая линия" (2003 г.). Кстати, последний сборник Дианы был издан "Мастацкай літаратурай", т.к. поэтесса выиграла грант по поддержке талантливой молодежи на издание сборника.

Согласно ст.ст. 992, 993 Гражданского кодекса и ст. 7 Закона "Об авторском праве и смежных правах", литературные произведения, к которым относятся стихотворения, являются объектами авторского права. Автору также принадлежит исключительное право осуществлять или разрешать осуществлять воспроизведение произведения и распространение экземпляров произведения путем продажи (ст. 16 Закона "Об авторском праве и смежных правах"). Использование же другими лицами объектов интеллектуальной собственности, в отношении которых их правообладателю принадлежит исключительное право (в том числе путем воспроизведения и распространения), допускается только с согласия правообладателя. Причем это согласие должно облекаться в форму авторского договора, который определяет способы использования произведения, срок, на который передается право, и территорию, размер вознаграждения за каждый способ использования произведения, порядок и сроки его выплаты, а также другие условия, которые стороны сочтут необходимыми (ст. 26 Закона "Об авторском праве и смежных правах").

В исковом заявлении сказано: *"С учетом допущенных ответчиками нарушений (опубликование произведений без разрешения правообладателя и коммерческое распространение книги с нашими произведениями без нашего согласия и без выплаты авторского вознаграждения), а также с учетом минимального размера компенсации (175000 руб.) считаем, что размер компенсации за нарушение авторских прав должен составить 250 тыс. рублей каждому из истцов".*

И вот состоялось судебное заседание, в ходе которого было заключено соглашение, по которому ответчики заплатили истицам по 190.000 белорусских рублей в качестве компенсации за нарушение авторских прав и возместили госпошлину в размере 19.000 для каждой из истиц.

"За торжество авторского права, — говорит Д.Балыко, — мы согласились не корысти ради, а ради справедливости принять эту компенсацию. Извинения принесены нам не были, хотя, в принципе, и не надо, т.к. если человек не считает себя виновным, то даже если он произнесет слова извинения, они все же будут звучать неискренне. Честно говоря, мне неважно, какова у издателей мотивация соблюдения авторских прав — внутренние убеждения или страх перед судом. Мне важно, что в следующий раз, прежде чем нарушить чьи-то права, издатель и составитель задумаются о том, чем это грозит. Сегодня наши требования удовлетворены, мое нарушенное право было защищено законом, и я думаю, что это достаточный урок для всех нарушителей авторских прав. Я получила не только моральное удовлетворение, но и определенный опыт ведения дел в суде".

Комментируя ситуацию, составитель "Антологии" А.Ю.Аврутин сказал, что эта книга вызвала огромный резонанс: была масса статей как в белорусских, так и в российских изданиях; за составление сборника и за собственную книгу господину Аврутину была вручена Первая международная литературная премия имени Симеона Полоцкого, которая учреждена в Москве, и получены благодарность и поздравления от Палаты представителей Национального собрания Беларуси.

Истицы также высказались по данному поводу: *"Нам кажется, что издание данной книги носит чисто коммерческий характер и являет собой желание издателя и составителя заработать моральные и материальные дивиденды на авторах, которые не получили ничего, даже авторского вознаграждения".*

"Я считаю, — говорит А.Ю.Аврутин, — *что составление "Антологии" — это определенное сподвижничество, которое впервые совершило издательство, выпустившее книгу за свои средства.*

И вот в какой-то момент появляются авторы, которые в "Антологии" могли бы и не присутствовать. Я включил их стихи, потому что они дарили мне свои книжки, а за одну даже просил руководитель Литературного объединения при педагогическом университете. В общем, они оказались в этой "Антологии" как бы авансом. Хотелось просто помочь людям, публикуя их рядом с именитыми, маститыми поэтами.

И вдруг оказалось, что при составлении антологии нарушены их авторские права. Такого удара в спину я не ожидал. Судя по всему, девушкам просто захотелось устроить себе пиар: они стали распространять заявления, собирать публику".

Истицы отстояли свои права. Ответчики не считают себя проигравшими. Однако каждый, кто творит — пишет стихи, картины, музыку — должен помнить, что историческую ценность его произведений оценит время, а авторские права ему придется отстаивать самому. И нет отдельного закона об авторских правах для маститых поэтов и отдельного — для начинающих. Перед законом — все равны. Кто опорочил себя — издатель, получивший литературную премию за книгу, изданную с нарушением авторских прав, или поэтессы, подавшие на него за это в суд — решать вам, читатели.

Наталья ГУСЕВА.

У Гомелі маршрутныя таксі будуць вазіць ветэранаў вайны бясплатна?

Гомельскі гарвыканкам выдаў распараджэнне, у якім абавязаў усіх юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, што выконваюць рэгулярныя экспрэс-перавозкі пасажыраў у горадзе, выдзяляць у маршрутных таксі адно месца для бясплатнага праезду інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Такое распараджэнне, як паведамляецца, прынята "ў мэтах паляпшэння сацыяльнага становішча інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, улічваючы іх стан здароўя, заслугі перад народам, у знак павагі за перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі".

Як заявіў БелаПАН юрыст Гомельскага аддзялення прафсаюза "Садружнасць" Віктар Ялфімаў, распараджэнне ўлад перавозчыкі ўспрынялі спакойна, бо выконваць яго не маюць намеру. Паводле слоў В.Ялфімава, гэтае распараджэнне супярэчыць артыкулу 53 закона "Аб аўтамабільных перавозках", дзе гаворыцца, што заказчык "абавязаны кампенсаваць выдаткі перавозчыка, звязаныя з перавозкай пасажыраў, што маюць ільготы на праезд, за кошт сродкаў адпаведнага бюджэту".

"Механізм кампенсацыі затрат распараджэнне не прадугледжвае, — падкрэсліў В.Ялфімаў. — Калі гарвыканкам прыменіць да прадпрымальнікаў санкцыі за невыкананне распараджэння, мы звернемся ў Гаспадарчы суд".

Алена ПАСКАННАЯ.

Фальшываманетчыкаў развялося...

У апошні час у Беларусі адзначаецца рост выпадкаў фальшываманецтва. Калі да 1990 года ў краіне рэгістраваліся адзінкавыя факты канфіскацыі падробленых купюр, то з 1993 па 2003 год іх крывая ўзнялася з адзнакі 955 да 2761 факта. За 4 месяцы гэтага года на тэрыторыі Беларусі зарэгістравана 988 такіх фактаў, канфіскаваны 2342 падробленыя купюры. Ад агульнай колькасці зарэгістраваных фактаў, 830, ці 84 працэнты, склаў збыт замежнай валюты, з якіх 671 — долары ЗША, 50 — еўра, 10 — рублі ЦБ Расіі, 8 — польскія злотыя.

Асаблівую занепакоенасць у МУС выклікае збыт падробленых рублёў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. За згаданы час зарэгістравана 158 такіх фактаў. Канфіскавана 406 купюр розных наміналаў. Найбольшую цікавасць у злачынцаў выклікаюць купюры вартасцю 5 і 10 тысяч рублёў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Ці зменіцца становішча цяжарнай жанчыны, якая працуе па кантракце?

Усе ведаюць, што зараз уводзяцца працоўныя кантракты. Калі тэрмін дзеяння кантракта заканчваецца, то начальнікі не жадаюць падпісваць яго пасля таго, як жанчына зацяжарыла. У выніку свайго становішча яна пазбаўляецца любога шанцу застацца на працы.

"Сапраўды, — кажа намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Таццяна Васільеўна Шэметавец, — *сёння, калі жанчына працавала па кантракце, тэрмін якога скончыўся, наймальнік можа разарваць з ёю працоўныя адносіны, нават нягледзячы на тое, што яна знаходзіцца ў водпуску па доглядзе за дзіцем да 3-х гадоў.*

Але зараз уносяцца змяненні ў Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь, дзе будзе запісана, што наймальнік не мае права перарваць працоўныя адносіны з жанчынай, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе за дзіцем, і таксама з цяжарнымі жанчынамі".

Наталля ГУСЕВА.

Помнік беларускім партызанам, што будуецца ў Мінску па праекце Валянціна Занковіча, будзе адкрыты 3 ліпеня

3 ліпеня на паўднёва-ўсходняй ускраіне горада Мінска, у пачатку Партызанскага праспекта, адбудзецца ўрачыстае адкрыццё помніка "Беларусь партызанская", які будуецца па праекце вядомага беларускага архітэктара і скульптара, лаўрэата Ленінскай прэміі ***Валянціна Занковіча****.*

У інтэрв'ю БелаПАН скульптар паведаміў, што ідэя гэтага помніка ўзнікла ў 2001 годзе пасля наведвання яго майстэрні кіраўніцтвам Мінгарвыканкама. "Улічваючы, што помнік планавалася размясціць на ўездзе ў сталіцу каля станцыі метрапалітэна "Магілёўская", я бачыў яго вельмі лаканічным па форме. Круглую непаліраваную калону шэрага граніту завяршае сімвал краіны — зубр, а на ім жанчына са сцягам — вобраз Перамогі. На падмурку калоны я размясціў барэльефы, якія адлюстроўваюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Побач з яе следам — драпінай на калоне — супрацьтанкавы ёж, бягучыя дзеці і жанчыны з торбамі, стары, які заклікае бежанцаў схавацца ў лесе, дзе партызанскі камандзір уручае зброю маладым хлопцам з навакольных вёсак", — сказаў майстар.

Паводле яго слоў, у праект мемарыяла ўвайшлі тры кампазіцыі, якія адлюстроўваюць ідэалогію партызанскага руху, а таксама рэйкавую вайну і бой у лесе, якія найбольш ярка характарызуюць барацьбу лясных мсціўцаў.

Акрамя таго, В.Занковіч прапанаваў уключыць у склад ансамбля Музей гісторыі партызанскага руху, складзены з найбольш яркіх рэліквій Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама палявы бівак, дзе мінчане маглі б пакаштаваць стравы партызанскай кухні перыяду Другой сусветнай вайны.

"Нягледзячы на тое, што гэтая задума была ўхвалена кіраўніцтвам горада, дзяржавы, горадабудаўнічым і мастацкім саветамі, праект чакаў цяжкі лёс", — падкрэсліў В.Занковіч.

Паводле яго слоў, у выніку трохгадовых дэбатаў ад першапачатковай канцэпцыі помніка застаўся адзін толькі знак, які давялося прыкметна паменшыць па вышыні (з 40 да 21 метра) і адмовіцца ад музея, палявога бівака і кампазіцый, размешчаных побач з калонай.

Зараз В.Занковіч, які з'яўляецца адным з аўтараў мемарыяльнага комплексу "Хатынь" і іншых вядомых помнікаў, прысвечаных тэме Вялікай Айчыннай вайны, працуе над праектамі развіцця мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" і манумента Перамогі на аднайменнай плошчы сталіцы, а таксама канцэпцыяй помніка Пятру Машэраву ў Мінску і мемарыяла ва ўрочышчы Курапаты, дзе, верагодна, пахаваныя астанкі яго бацькі — настаўніка, расстралянага супрацоўнікамі НКУС у 1937 годзе.

Марат ГАРАВЫ.

У славян будзе свая электронная бібліятэка

Для нашай краіны будаўніцтва новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі з'яўляецца своеасаблівай прыступкай, якая паслужыць асновай для шэрагу праектаў у рамках развіцця бібліятэчнай справы, славянскага пісьменства і культуры.

Пачалі актыўна распрацоўвацца доўгатэрміновыя праекты. У першую чаргу гэта такі праект, як "Памяць Беларусі". *"Яе мэта,* — гаворыць дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, — *перанесці на электронныя носьбіты найбольш каштоўныя помнікі пісьменнасці. Дарэчы, канцэпцыя аналагічнай праграмы распрацавана і ў Расіі.*

Таксама паміж Нацыянальнай бібліятэкай і Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай распрацавана канцэпцыя сумеснага праекта "Скарбніца славянскай культуры". Спадзяёмся, што да нас далучацца і іншыя бібліятэкі. У выніку дадзенага праекта будзе створана электронная славянская бібліятэка, якая аб'яднае найбольш каштоўныя рэчы. Дзейнасць у гэтым накірунку актыўна падтрымліваецца ЮНЕСКА".

На сённяшні дзень, па словах Р.Матульскага, існуюць чатыры праекты, накіраваныя на захаванне славянскага пісьменства і культуры. Зараз ідзе праца над праектам "Анталогія беларускай літаратурнай класікі", мэта якога — праз электронныя носьбіты зрабіць даступнымі найбольш каштоўныя беларускія выданні. Усё гэта робіцца для таго, каб помнікі славянскага пісьменства і культуры зрабіць больш даступнымі не толькі для жыхароў нашай краіны, але і для ўсяго сусвету цалкам.

Наталля ГУСЕВА.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Музей, у якім былі Уладзімір Караткевіч і Алексій II...

Трапіць сюды чалавеку з вуліцы зусім не проста, бо, хоць у музеі старажытнабеларускай культуры пры Нацыянальнай акадэміі навук раз-пораз і праводзяцца экскурсіі, ён лічыцца паўзакрытай установай... У гэтыя дні музей святкуе свой 25-гадовы юбілей. У свой час яго наведвальнікамі былі і прэзідэнт Акадэміі навук СССР Анатоль Аляксандраў, і пісьменнік Уладзімір Караткевіч, і Алексій II, і іншыя.

Сярод экспанатаў музея ёсць незвычайная ікона XVI стагоддзя, якой у свой час было забіта акно ў царкве...

Журналісту "Народнай волі" давялося пабываць на экскурсіі ў гэтым музеі, якую цікава правёў яго дырэктар **Барыс Лазука.**

Гісторыя сучаснага музея старажытнабеларускай культуры распачалася яшчэ ў 70-х гадах мінулага стагоддзя. Тады групай энтузіястаў ладзіліся паездкі па розных мясцінах нашай краіны. У тых вандроўках удзельнікі гістарычнага гуртка, які функцыянаваў пры Акадэміі навук, збіралі разнастайныя экспанаты для будучага музея. Ля вытокаў яго стварэння стаялі вядомыя сёння навукоўцы: Юрый Хадыка, Валерый Філіпаў, Вольга Церашчатава, Элеанора Вецер і іншыя...

Спачатку экспанаты, якія прывозіліся з экспедыцый, збіраліся ў асобным пакойчыку Інстытута мастацтвазнаўства, а потым, калі высветлілася, што сярод іх ёсць унікальныя рэчы, было прынята рашэнне аб стварэнні музея.

Зараз агульная плошча музея і музейнага фонду — 1080 квадратных метраў, а ў экспазіцыі прадстаўлена прыкладна 1/20 частка з 29.960 мастацкіх адзінак, якія мае музей...

У першай зале музея старажытнабеларускай культуры сярод твораў жывапісу, твораў народнага ткацтва прадстаўлены два унікальныя экспанаты, аналагаў якім няма нідзе ў нашай краіне — гэта слуцкія паясы XVIII стагоддзя — часу росквіту слуцкай мануфактуры. Для іх вытворчасці выкарыстоўвалася залатая ніць. Залататканыя паясы аздоблены прыгожым арнаментам і адпаведнымі надпісамі на іх.

Сярод скульптурных твораў асаблівай адметнасцю вылучаюцца чатыры мармуровыя скульптуры з надмагілля Паўла Сапегі, якія ў свой час былі прывезены ў музей з Гальшан. Гэта выявы з Паўла Сапегі і трох яго жонак, якія датуюцца пачаткам XVII стагоддзя. Як вядома, у гэты час на Беларусі зараджаўся маньерызм. Гэта бачна ў мастацкім рашэнні скульптур — выявы Паўла Сапегі і яго жонак зафіксаваны ў манерных позах, а іх целы крыху выцягнутыя.

Амаль у кожнага экспаната свая незвычайная гісторыя. Напрыклад, алтарная ікона XVI стагоддзя "Маці Боская Іерусалімская" была знойдзена ў зачыненай царкве ў вёсцы Здзітава што на Брэстчыне. Ёю было забіта царкоўнае акно, але падчас рэстаўрацыйных работ удалося аднавіць яе ў належным выглядзе.

Гордасцю музея па праве можа лічыцца амаль поўная калекцыя народных беларускіх строяў, якія выраблены ўручную ў XIX—XX стагоддзях. Тут жа размяшчаюцца ручнікі, фрагменты слуцкіх паясоў, кілімы і коўдры, посцілкі, прывезеныя ў музей з розных куткоў нашай Радзімы.

Музей можа пахваліцца і калекцыяй керамікі і кафлі: тут прадстаўлены як прасцейшыя ўзоры гэтых прадметаў у выглядзе гаршчкоў, якія вырабляліся на ганчарным крузе, так і "складаныя" і вельмі прыгожыя кафлі з выявамі разнастайных гербаў і нават партрэтамі...

Акрамя вышэйзгаданых экспанатаў, у музеі можна ўбачыць прылады працы, прадметы побыту розных часоў, вялікую калекцыю шкляных вырабаў... Карацей, музей старажытнабеларускай культуры — сапраўдная скарбніца, а прыхільнікам гісторыі Беларусі тут ёсць на што паглядзець.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЗАДУМАЙСЯ!

Дым сигарет с... ядом

31 мая — Всемирный день без табака



Большинство курильщиков, особенно молодежь, считают, что табак не приносит особенного вреда. В отношении курения есть очень меткий афоризм: человек начинает курить, чтобы приблизить время своего совершеннолетия, и перестает курить, чтобы отдалить свой последний час.

В табачном дыму содержится не менее 7 тысяч различных веществ. Более 30 из них обладают пагубным воздействием на организм человека (например, окись углерода, синильная кислота, двуокись азота, радиоактивный полоний 210, радиоактивный свинец и пр.).

Наиболее активным компонентом табачного дыма является никотин. По ядовитости его сравнивают с синильной кислотой. Их смертельные дозы для человека одинаковы и составляют 0,08 грамма.

Никотин у курильщика включается в процесс обмена веществ и становится неотъемлемой его частью. Отсутствие в организме никотина, ставшего привычным химическим веществом, вызывает раздражительность, неустойчивое настроение, нарушение сна, чувство неудовлетворенности, потребность вновь и вновь тянуться к сигарете.

В результате у курильщика рано или поздно возникают патологические изменения в дыхательных путях, желудочно-кишечном тракте, сосудах сердца, мозга, конечностей, что приводит к развитию различных заболеваний, иногда тяжелых, к сокращению срока жизни.

Проходя через полость рта, табачный дым разрушает зубную эмаль, способствует возникновению кариеса зубов, ускоряет развитие пародонтоза.

Пагубное влияние оказывают компоненты табачного дыма на сердечно-сосудистую систему. После выкуривания только одной сигареты сосуды около получаса находятся в состоянии спазма. По суженным сосудам к тканям и органам поступает значительно меньше питательных веществ и кислорода. Чтобы "протолкнуть" кровь через узкий просвет сосудов, сердце вынуждено работать с большим напряжением. Такой режим работы сердца неэкономичен, так как постоянная излишняя нагрузка ведет к преждевременному изнашиванию сердечной мышцы. Все это способствует раннему развитию ишемической болезни сердца, инфаркты в молодом возрасте встречаются почти исключительно у курильщиков. Курение приводит также к поражению сосудов головного мозга. Обедненная кислородом кровь поступает к мозгу в меньших количествах, что вызывает ухудшение памяти, быструю утомляемость, головные боли. Развивается атеросклероз сосудов головного мозга, осложняется течение гипертонической болезни. У курильщиков в 3—4 раза чаще возникают острые нарушения мозгового кровообращения, которые ведут к тяжелой инвалидности или летальному исходу. Наблюдается целый ряд болезненных отклонений со стороны органов пищеварения — тошнота, иногда рвота, боли в желудке и кишечнике, расстройство стула, снижение аппетита и усвояемости пищи.

Чрезвычайную опасность представляют продукты сгорания табака для плода, развивающегося в организме будущей матери. Никотин очень быстро проникает через плацентный барьер и накапливается в организме плода. Перинатальная смертность (то есть суммарная величина дородовой гибели, смертности во время родов и в первую неделю жизни) детей курящих матерей на 28% выше, чем некурящих.

Ольга ЗИМЯНИНА,
врач-стоматолог
7-й стоматологической поликлиники Минска.

Рекомендации доктора Роберта Вагнера тем, кто еще не бросил курить:

1.Стараться выкуривать как можно меньше сигарет, стремясь к тому, чтобы сегодня было выкурено меньше, чем вчера.
2.Затягиваться менее часто и неглубоко.
3.Не курить на голодный желудок, а тем более натощак, так как продукты распада табака, смешиваясь со слюной, поражают стенки желудка.
4.Между затяжками не оставлять сигарету во рту.
5.Выбрасывать сигарету недокуренной на одну треть.
6.Не курить на ходу, особенно поднимаясь по лестнице.
7.Как можно дольше не курить после значительной физической нагрузки.
8.Предпочитать сигареты с фильтром.
9.Время от времени устраивать перерывы в курении (не курю до понедельника, до конца месяца, дня рождения, до Нового года и т.д.).
10.Не курить, когда курить не хочется.

Среда, 26 мая

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12,00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Новости.
07.05, 07.35, 08.10, 08.35 "Доброе утро, Беларусь!".
07.30, 08.30, 19.55 "Деловая жизнь".
09.05 "Хозяева земли".
09.25, 19.15 "Сага о Форсайтах". Сериал.
10.05, 20.00 "Сокровища мертвых". Сериал.
11.10, 17.30 "Богатые и знаменитые". Сериал.
12.10, 16.45 "Моя страна".
12.25 "Ассоциация злоумышленников". Комедия.
14.15 "На перекрестках Европы".
15.10 "Самые, самые, самые". Сериал.
16.05 "5х5".
17.15 "Специальный репортаж".
18.30 "Кстати".
19.05 "100 шагов к Олимпу".
21.00 "Панорама".
21.35 Футбол. Финал. Лига чемпионов.
23.30 "Дорога к Евро-2004".

ОНТ

07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.20 "Наши новости".
07.05 "Наше утро".
09.05, 19.05 "Клон". Сериал.
09.55, 18.10 "Дом". Реалити-шоу.
10.40 "Не только о футболе".
11.00 "Дисней-клуб".
15.00 "Город женщин".
15.55 "Берег мечты". Сериал.
16.50 "Большая стирка".
20.00 "Время".
21.05 "Другая жизнь". Сериал.
22.15 "Улицы разбитых фонарей". Сериал.
23.35 "Фабрика звезд-4".

РОССИЯ

07.45, 21.00 "Команда "01". Огнеборцы". Сериал.
08.50 "Короткое замыкание". Ток-шоу.
09.45 "Вести. Дежурная часть".
10.00, 16.00, 19.00 "Вести".
10.30, 19.30 "Местное время. Вести — Москва".
10.50 "Чтс хочет женщина".
11.50, 19.55 "Гражданин начальник". Сериал.
16.10 "Пирамида".
16.40 "Инструктор". Сериал.
17.35 "Комиссар Рекс". Сериал.
18.30 "Кулагин и партнеры".
19.50 "Спокойной ночи, малыши!".
22.00 "Вести +".
22.20 "Исторические хроники".
23.30 "Пистолет с глушителем". Комедия.

ЛАД

06.30 EURONEWS.
08.00, 14.00, 20.00 Новости.
08.10 "Площадь искусств".
08.35, 22.05 "Свободная женщина-2". Сериал.
09.35 "Сад мечты".
10.10, 18.25 "Между нами, женщинами". Тележурнал.
10.30, 21.15 "Грешная Анхелика". Сериал.
11.15, 13.00 "Обычный необычный день".
11.50, 18.45 "Плач перепелки". Сериал.
13.25, 16.10 Мультфильмы.
14.10 "Мультиклуб".
15.05 "Команда "SOS". Сериал.
15.30 "Не зевай!".
15.40 "Бум". Тележурнал для школьников.
16.30 "Шаги по западной границе". Док.фильм.
17.05 "Росчерк времени".
17.20 "Столкновение". Мелодрама.
20.15 "Колыбельная".
20.30 "Дела семейные".
22.55 Тяжелая атлетика.

НТВ

09.00, 11.00, 16.00, 18.00 "Сегодня".
09.25 "Кулинарный поединок".
10.20 "Страна советов".
14.35 "Принцип домино".
16.30 "Дикий мир: борьба за выживание".
17.35 "Протокол".
18.40 "Господа офицеры". Сериал.
19.45 "Бальзаковский возраст, или Все мужики — сво...". Сериал.
21.00 "Страна и мир".

СТВ+RenTV

06.30, 18.00 "Минщина. Люди, события, факты".
06.45 "Утро столицы".
07.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 "24 часа".
07.50, 20.00 "СТВ-спорт".
08.05 "Минск и минчане".
08.15, 23.05 "Технология".
08.25, 20.40 "Автопанорама".
08.45 "Закон и криминал".
09.00 "Закусочная на колесах". Комедия.
10.50 "Апокрифы ранних крестьян". Док.фильм.
11.20 "Горячий лед".
11.40 "Аргонавты". Мультфильм.
12.00 "Час суда".
13.00 "Дикая планета. Все о собаках".
13.50 "Благословите женщину". Сериал.
14.50 "Мятежный дух". Сериал.
15.40 "Пауэр рейнджерс, или Могучие рейнджеры в космосе". Сериал.
16.00 "Веселые баксы".
16.15 "Тема дня".
16.50 "Игровой рефлекс".
17.00 "Крутой Уокер". Сериал.
18.15 "Здравствуйте, доктор!".
18.30 "Нина". Сериал.
20.15 "Минск и минчане".
20.25 "Добрый вечер, малыш...".
20.55 "Защита от дурака". Триллер.
23.15 "Проект "Отражение". "Чужие". Док.фильм.
00.05 "Секретные материалы". Сериал.
00.50 "Новости СНГ".

8-Й КАНАЛ

17.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
17.45 "Карусель". Худ.фильм.
19.10 "К-видео" — "Топ-8".
19.20 "Доброе слово Василия Киселева".
19.30 "Вечный зов". Сериал.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Европа сегодня".
21.30 "Денежный поезд". Боевик.

ТВ ЦЕНТР

04.45, 06.30 "Настроение".
07.35 "Газетный дождь".
07.45 "Женщина в белом". Мелодрама.
09.15 "Дорогие мои москвичи".
09.40 "Телемагазин".
10.00, 13.00, 17.00. 21.00 "События. Время московское".
10.15 "Дата".
11.10 "Отдел "Х".
11.50 "Квадратные метры".
12.05, 23.00 "Петровка, 38".
12.25 "Деловая Москва".
13.15 "Инспектор Кресс". Сериал.
14.30 "Мода non-stop".
15.00 "Регионы: прямая речь".
15.30 "Без репетиции".
16.00 "Уголовная полиция". Сериал.
17.15 "Русский век".
18.00 "Страсти по Саломее". Сериал.
18.50 "Пять минут деловой Москвы".
18.55 "Крысиный угол". Боевик.
20.40 "ЧП в большом городе". Спецрепортаж.
21.40 "Версты". Ток-шоу.
22.30 "Времечко".
23.20 "25-й час. События. Время московское".
23.45 "Супердиск".
00.00 "По закону". Сериал.
01.00 "Синий троллейбус".

EUROSPORT

09.30 Экстремальный спорт. "Молодежная зона".
10.00 Футбол. Евроголы.
11.00, 12.00, 18.30, 21.00, 22.00 Теннис. Открытый чемпионат Франции.
23.00 Мультиспорт. "Выбор по средам".
23.15 Гольф. Открытый чемпионат Гермнии.
23.45 Гольф. Турнир PGA.
01.00, 02.15 Новости "Евроспорта".
01.15 Велоспорт. чемпионат мира на треке в Австралии.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, правы ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на ААТ «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 27 510 экз. Заказ № 654.